УДК 379.852:376.2(476)

# ПАШЫРАЕМ МЕЖЫ – ІНКЛЮЗІЯ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

***Шарэнда Г. П.***

*Бібліятэка-філіял № 5 дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»*
*вул. Пушкіна, 30, Гродна, Рэспубліка Беларусь 230012,*
*cbsfilialdet5@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца развіццё інклюзіі ў бібліятэцы на аснове дзейнасці філіяла № 5 дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна». Разгледжаны два віды інклюзіўных экскурсій, якія робяцца бібліятэкарамі: для людзей з фізічнымі асаблівасцямі развіцця, для людзей з ментальнымі асаблівасцямі развіцця. Прыведзены прыклады тэматычных экскурсій па аб'ектах і турыстычных маршрутах г. Гродна і Гродзенскага раёна з апісаннем асаблівасцей падрыхтоўкі і правядзення для эксурсавода. Зроблены вывады аб вялікай запатрабаванасці дадзенай работы ў людзей з абмежаваннямі ў фізічным і ментальным развіцці, але не падрыхтаванага для інклюзіўнага турызму безбар'ернага асяроддзя.

***Ключавыя словы:*** турызм; інклюзія ў бібліятэцы; інклюзіўны турызм; даступны турызм; інклюзіўны экскурсавод; рэкрэацыя; сацыялізацыя; рэабілітацыя; людзі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя; інклюзіўная экскурсія; ментальныя асаблівасці; фізічныя асаблівасці.

# EXPANDING BOUNDARIES – INCLUSION IN THE LIBRARY

***Sharenda H. P.***

*Library Branch № 5 of the State Institution of Culture «Centralized Library System of the city of Grodno»*
*30 Pushkina street, Grodno, Republic of Belarus, 230012*
*cbsfilialdet5@gmail.com*

The article considers the development of inclusion in the library on the basis of the activities of Branch № 5 of the State Institution of Culture «Centralized Library System of the city of Grodno». There are have been considered two types of inclusive excursions made by librarians: for people with physical features of development, for people with mental features of development. There have been given examples of thematic tours across the objects and tourist routers of the city of Grodno and the Grodno province with the description of peculiarities of preparation and carrying out for the tour guide. It has been concluded that this work is in great demand among people with disabilities in physical and mental development who are not prepared for inclusive tourism in the barrier-free environment.

***Key words:*** tourism; inclusion in the library; inclusive tourism; affordable tourism; inclusive tour guide; recreation; socialization; rehabilitation; people with disabilities; inclusive excursion; mental features; physical features.

Бібліятэка як сацыяльна-культурны інстытут даўно працуе з людзьмі, якія маюць асаблівыя патрэбы ў развіцці, на дазеным этапе з'яўляюцца пляцоўкай для нэтворкінга. Бібліятэкі выступаюць асяроддзем, дзе налажваюцца і будуюцца сацыяльныя і дзелавые сувязі. Праблеме інклюзіі бібліятэкі надаюць вялікую ўвагу [1], а менавіта рэалізацыі мэты № 10: Скарачэнні няроўнасці ўнутры краін і паміж імі, якая ў шэрагу мэтаў устойлівага развіцця, прынятых краінамі ААН [2].

Бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» даволі працяглы перыяд працуюць з сацыяльна неабароненымі

групамі насельніцтва, праводзячы цыкл мерапрыемстваў «Мы і асаблівыя дзеці» і «Будзем разам». У табліцы прадстаўлены бібліятэкі цэнтралізаванай сістэмы г. Гродна і ўстановы і групы людзей з абмежаванымі фізічнымі і ментальнымі магчымасцямі, з якімі вядзецца супраца ў рамках цыклаў.

**Табліца. Бібліятэкі цэнтралізаванай сістэмы г. Гродна і ўстановы, з якімі вядзецца супраца**

| Бібліятэкі | Установы з сацыяльна неабароненымі групамі людзей |
|---|---|
| Спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку | Гродзенская абласная арганізацыя грамадскага аб'яднання «БелТІЗ» (Беларускае таварыства інвалідаў па зроку) і інш. |
| Аддзел абслугоўвання дзяцей Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка | Дапаможная школа № 1 для дзяцей з псіханеўралагічнымі асаблівасцямі развіцця |
| Бібліятэка-філіял № 3 | Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна (аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў) |
| Бібліятэка-філіял № 4 | Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна (аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў) |
| Бібліятэка-філіял № 8 | Спецыяльная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху |
| Бібліятэка-філіял № 5 | Дапаможная школа № 1 для дзяцей з псіханеўралагічнымі асаблівасцямі развіцця;<br>Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна (аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў);<br>Сярэдняя школа № 16 г. Гродна, спецыяльныя класы для дзяцей з парушэннем слыху |

Адным з відаў інклюзіі з'яўляецца спецыялізаваная экскурсія. На базе бібліятэкі № 5 арганізуюцца і праводзяцца такія экскурсіі. Умоўна іх можна падзяліць на два віды:

– экскурсіі для людзей з ментальнымі асаблівасцямі развіцця;
– экскурсіі для людзей з фізічнымі асаблівасцямі развіцця.

Кожны з гэтых відаў мае свае падвіды. Падрабязней разглядзім арганізацыю і правядзенне экскурсіі пад назвай «На кончыках пальцаў» для людзей з праблемамі зроку.

Экскурсію «На кончыках пальцаў» ладзіла бібліятэка № 5 сумесна са спецыяльнай бібліятэкай для інвалідаў па зроку. Праблемныя моманты экскурсіі для невідушчых, з якімі сутыкнуліся супрацоўнікі бібліятэкі:

– выбар маршруту;
– апісанне маршруту і аб'ектаў.

Праблема выбару маршрута. Гродна як турыстычны горад вельмі прывабны, але не для людзей з фізічнымі асаблівасцямі развіцця. Маршрут павінен быў закранаць помнікі да якіх можна дакрануцца, адчуць кончыкамі пальцаў, бо ў Гродне практычна адсутнічае спецыялізаваная сістэма інфармацыі на гістарычных помніках (візуальныя прылады, акустычныя і тактыльныя сродкі сувязі, таблічкі са шрыфтам Брайля, мнемасхемы).

З улікам пералічанага для экскурсіі «На кончыках пальцаў» былі выбраны наступныя маршурт і аб'екты: помнік на месцы касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі (Фара Вітаўта), сквер па вуліцы Замкавай; мемарыяльная дошка вязням гета № 1 – жылы дом на вуліцы Замкавай,14; унутраны дворык дзяржаўнага музея гісторыі

рэлігіі і скульптура Вітаўта Вялікага паміж Старым і Новым замкамі на гэтай жа вуліцы.

Вельмі важным момантам выбару маршрута з’яўляліся камфортнасць і даступнасць вулічна-дарожнай сеткі. Агулам у горадзе і нават у яго цэнтры адсутнічае тактыльная плітка, вышыня бардзюраў не адпавядае патрабаванням безбар’ернага асяроддзя для свабоднага перамяшчэння невідушчых, а таксама іншых людзей з фізічнымі абмежаваннямі, тым больш для арганізацыі для іх турыстычных маршрутаў. Вуліца Замкавая больш-менш адпавядае асноўным патрабаванням для магчымасці правядзення экскурсіі для людзей з праблемамі зроку.

Цяжкасцю выступіла афіцыйнае апісанне аб’ектаў і маршрута. Апісанне архітэктурных помнікаў не ўлічвае асобна патрабаванні падачы матэрыялу людзям з праблемамі зроку, якія ўспрымаюць інфармацыю па-іншаму. Наогул, класічная методыка правядзення экскурсіі не прыстасаваная для дадзенай групы. Таму адмыслова для экскурсіі «На кончыках пальцаў» ствараліся аўдыёдыскрыпты на «зразумелай» для дадзенай групы экскурсантаў мове.

Падача інфармацыі для людзей з праблемамі зроку павіна быць дакладнай. Напрыклад, схематычна гэта можна прадставіць так: гэты помнік зроблены з дуба, яго вышыня 6 метраў, шырыня 0,50 см. Ідэальнай была б сітуацыя, калі ля кожнага помніка архітэктуры былі б усталяваныя макеты з дакладнай перадачай асаблівасцей дадзенага будынка, а таксама была пазнака пра маштабную суаднесенасць памераў чалавека і архітэктурнага аб’екта.

Другі від экскурсій – экскурсіі для людзей з ментальнымі асаблівасцямі развіцця. Бібліятэка ладзіць іх для групы аддзялення дзённага наведвання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна».

Супрацоўнікамі бібліятэкі № 5 былі праведзены:

– ваенна-гістарычная экскурсія на ІІ форт Гродзенскай крэпасці;
– экскурсія ў Свята-Пакроўскі кафедральны сабор;
– экскурсія ў Рэктаральны касцёл Звеставання Найсвяцейшай Панны Марыі (Брыгіцкі кляштар);
– экскурсія ў Свята-Марфінскую царкву і Гродзенскі некропаль;
– экскурсія да Дня маці «Любімай маме» (выязная па маршруце Гродна-Сапоцкін-Гродна).

Спецыфіка экскурсій для людзей з ментальнымі асаблівасцямі заключаецца ў падачы інфармацыі, агульнай працягласці, відах паказу і аповеду.

Падчас правядзення экскурсіі лепш выкарыстоўваць другую групу з метадычных прыёмаў аповеду. Інфармацыя ад экскурсавода павінна быць максімальна спрошчанай з выкарыстаннем зразумелай мовы і простых па пабудове сказаў. Лепш, калі гэта дыялог, а не маналог экскурсавода.

Вельмі добра, калі тэматычная экскурсія для людзей з ментальнымі асаблівасцямі інтэрактыўная. Так, напрыклад, на ІІ форце Гродзенскай крэпасці цікавасць уяўляла не толькі абарончая канструкцыя, але і наросты на сценах – сталакціты і сталагміты як у звычайных пячорах. Магчымасць убачыць усё гэта і сфатаграфаваць выклікала шмат пазітыўных эмоцый, бо інтэрактыўнасць наведвальнікаў пячоры не абмяжоўвалася.

Экскурсіі па храмах арганізоўваліся пры падтрымцы мясцовых святароў, якія дазвалялі праявіць інтэрактыўнасць. Напрыклад, у Свята-Пакроўскім кафедральным саборы была магчымасць падняцца на званіцу і паспрабаваць званіць у званы.

У Брыгіцкім кляштары ксёндз Антоній Грэмза паказаў унікальны музей, які знаходзіцца ў скляпеннях касцёла. Там захоўваюцца незвычайныя і рэдкія рэчы, якія можна было ўбачыць, а некаторыя памацаць: старадаўнія біблії, пашкоджаныя карціны, старыя друкарскія машыны і інш.

Для людзей з ментальнымі асаблівасцямі развіцця захапляльна было бачыць дряўляны лямус (гаспадарчы будынак, пабудаваны ў XVIII ст. без выкарыстання

цвікоў), прайсціся па памяшканнях помніка архітэктуры і дакрануцца да старажытнага драўлянага матэрыялу.

У Свята-Марфінскай царкве святар Аляксандр паказаў, як правільна кадзіць кадзілам і дазволіў паспрабаваць здзейсніць гэтую справу экскурсантам.

Выязная экскурсія Гродна – Сапоцкін – Гродна ладзілася да Дня маці і пазнаёміла падарожнікаў з гісторыяй мястэчка Сапоцкін і экспанатамі музея «Сапоцкінская пісанка». Унікальны роспіс велікодных яек унесены у Спіс нематэрыяльнай спадчыны Беларусі і выклікае вялікую цікаўнасць у наведвальнікаў.

Асаблівую прывабнасць для інклюзіўнага турызму мае экспазіцыя музея «Сапоцкінская пісанка» пад назвай «Нам засталася спадчына», дзе прадстаўлены макеты галоўных славутасцей Гродзенскага раёна. Макеты выкананы вядомым гродзенскім інжынерам Ігарам Адасікам. Да іх можна дакрануцца, разгледзіць падрабязна, як выглядае той ці іншы архітэктурны аб’ект, бо ў рэальную велічыню не заўсёды бачны знешнія архітэктурныя асаблівасці.

Недахоп музейнай экспазіцыі «Нам засталася спадчына» – маленькая плошча памяшкання, у якой яна разгорнута. Зала не можа змясціць мінімальную колькасць экскурсантаў ці турыстаў з фізічнымі асаблівасцямі развіцця. Так, максімальная колькасць людзей з праблемамі зроку, якія тут могуць быць, – 5 чалавек, і ўсяго 1 інвалід-вазочнік можа адчуць сябе камфортна ў гэтай зале.

Гродзенскія бібліятэкі імкнуцца браць удзел у розных інклюзіўных фестывалях і іншых імпрэзах, у тым ліку міжнародных. У снежні 2021 года запланавана інтэрактыўная інклюзіўная экскурсія ў межах Усерасійскага фестывалю «Эстафета дабрыні-2021». Арганізатарам фестывалю выступае Санкт-Пецярбургская дзяржаўная спецыяльная цэнтральная бібліятэка для сляпых і слабавідушчых. Эстафета дабрыні праводзіцца з 2018 года і прымеркавана да Міжнароднага дня інвалідаў (3 снежня). Інклюзійная экскурсія «У госці да францысканцаў: знаёмства з барочным помнікам архітэктуры» рыхтуецца для людзей з ментальнымі асаблівасцямі развіцця.

Бібліятэка ў сваей дзейнасці выкарыстоўвае новыя формы працы з сацыяльна неабароненымі групамі насельніцтва [3]. Адной з такіх неўласцівых для бібліятэкі форм з’яўляецца інклюзіўная экскурсія. Як паказвае вопыт бібліятэкі-філіяла № 5 дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», правядзенне такіх экскурсій магчымае, і яны неабходныя для людзей з фізічнымі і ментальнымі асаблівасцямі развіцця. А для другой названай групы інвалідаў такія экскурсіі нават больш даступныя. Можна адзначыць, што інклюзіўныя экскурсіі з ітэрактыўнымі элементамі вельмі запатрабаваныя гэтымі катэгорыямі людзей.

Правядзенне інклюзіўных экскурсій дапамагае сацыялізацыі людзям з абмежаванасцямі, робіць іх больш заўважнымі і паказвае, што гарадская прастора можа быць прыязнай і для іх. Гродзенскія бібліятэкі разумеюць перспектыўнасць такіх экскурсій, адчуваюць цікавасць да гэта накірунку сваей дзейнасці, плануюць пашыраць і ўдасканальваць свой вопыт.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Королёва, В.В. Инклюзия в библиотеках. С чего начать? // Проектирование и развитие городской образовательной инфраструктуры: сб. статей. Москва, 2021. С. 152–159.
2. Цели в области устойчивого развития. URL: https://www.un.org/sustainabledevelopment/ru/sustainable-development-goals/ (дата обращения: 22.11.2021).
3. Роль библиотек в условиях системы инклюзивного культурного пространства / Ростов. обл. спец. б-ка для слепых; сост. О. В. Глазунова. Ростов-на-Дону, 2013.